**ВОДЗЫЎ**
афіцыйнага апанента
аб дысертацыйным даследаванні
**Алесі Анатольеўны НОСІК**
**«Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне»,**
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання цалкам адпавядае галіне навукі (філалогія) і спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

**Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання.**

Сучасны этап развіцця лінгвістычнай навукі ў цэлым і характарызуецца тым, што на змену структурна-граматычнаму і апісальнаму падыходам да сістэматызацыі моўна-маўленчага матэрыялу прыходзіць новая задача – тлумачэнне адпаведных катэгорый, рэалізаваных у моўных адзінках. Альтэрнатыва фармальна-апісальнай лінгвістыцы – катэгарыяльна-арыентаваная тыпалогія, якая зыходзіць з пазіцый абавязковай рэалізацыі ў камунікатыўнай сферы чалавечага інтэлекту, а таксама эмоцый і пачуццяў.

У наш час агульнапрызнанымі з’яўляюцца поспехі структурнай лінгвістыкі ў інтэрпрэтацыі фактаў катэгарызацыі і канцэптуалізацыі свету чалавекам, у асвятленні найбольш складаных праблем семантыкі моўных форм, ва ўдакладненні самога паняцця моўнага значэння як непарыўна звязанага з інтэлектам, ведамі, з адлюстраваннем чалавечага вопыту. Прапанаваны дысертанткай падыход дазваляе ўбачыць факты мовы ў новым святле, паколькі ён мае непасрэднае дачыненне да працэсу рэалізацыі эмоцый, да таго, як эмацыйная сфера прадстаўлена ў нашай свядомасці і, адпаведна, у мове.

Актуальнасць дысертацыі вызначаецца, па-першае, самім зваротам да праблем катэгарыяльнасці ў мове (пытанне знаходзіцца ў запатрабаваным сучаснай навукай аб мове рэчышчы работ камунікатыўна-функцыянальнага і лінгвапрагматычнага характару, пры гэтым апісанне, навуковае абгрунтаванне сістэмна-моўных універсалій – надзённая і напростая філалагічная задача), і, па-другое – выніковай спробай запоўніць своеасаблівую лакуну беларускай навукі ў галіне даследавання эмацыянальных намінацый.

Тэарэтычная значнасць працы вызначаецца складанасцю, неадназначнасцю, сінкрэтычнасцю самой з’явы, пазначанай тэрмінам эматыўнасць. Тэарэтычна каштоўным уяўляецца падыход да вывучэння неадназначнага аб’екта з пазіцыі поле – перыферыя, таму яго дэталёвае вывучэнне з’яўляецца актуальным і для агульнага мовазнаўства.

**Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Пра верагоднасць і абгрунтаванасць вынікаў праведзенага даследавання сведчыць:

– карэктнасць аўтарскай інтэрпрэтацыі аналізуемага моўнага матэрыялу разам са спасылкамі на значную колькасць даследаванняў айчынных і замежных вучоных у сумежных з лінгвістыкай абласцях ведаў – філасофіі, антрапалогіі, нейрафізіялогіі, псіхалогіі і інш. (спіс выкарыстанай літаратуры ўключае 293 пазіцыі);

– дастатковы аб'ём фактычнага матэрыялу (больш за 1100 лексічных намінацыі, выбраныя ТСБМ у 5 тамах, а таксама з «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» 2022 г. і Беларускага N-корпусу і засведчаныя больш чым ў 2800 тэкставых фрагментах).

– сістэмнасць лінгвістычнага аналізу і паслядоўнае захаванне метадалогіі даследавання: карэктнае выкарыстанне метадаў суцэльнай выбаркі, апісання, колькасна-стытыстычнага аналізу.

– несупярэчлівасць і абгрунтаванасць вынікаў, што пацвярджаецца колькаснымі дадзенымі і грунтоўнымі дадаткамі да дысертацыйнага даследавання, якія змяшчаюць канкрэтны моўны матэрыял («Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека» і акт аб укараненні ў навучальны працэс кафедры беларускай і рускай моў УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» (акт аб укараненні 25.11.2022);

– выкарыстанне распрацаваных аўтарам новых метадалагічных прынцыпаў і параметраў тыпалогіі для аналізу і сістэматызацыі моўных адзінак.

Вывады зроблены А.А. Носік на аснове кваліфікаванага аналізу значнай колькасці фактычнага матэрыялу, таму з'яўляюцца абгрунтаванымі і пераканаўчымі. Вынікі дысертацыйнага даследавання выкладзены паслядоўна і лагічна, сфармуляваны карэктна, маюць завершаны характар і змяшчаюць неабходныя спасылкі на літаратуру.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

А. А Носік упершыню на аснове аб'ёмнага і пераканаўчага фактычнага матэрыялу правяла комплекснае даследаванне лексікі эмацыянальнай сферы ў беларускай мове і выявіла спецыфіку рэпрэзентацыі субстантыўных, аэ'ектыўных і дзеяслоўных эмацыянальных намінацый.

У дысертацыйным даследаванні саіскальніцы ўпершыню ў беларускай лінгвістыцым глыбока і ўсебакова даследаваны лексікон айчыннай літаратурнай мовы ў эмыцыйным аспекце, здзейснена выніковая спроба запоўніць гэтую лакуну, бо, як сведчыць грунтоўны агляд науковай літаратуры па праблеме, эматывам прысвечана дастаткова многа работ, што сведчыць аб даследчыцкай цікавасці да гэтага боку мовы рускіх і замежных моваведаў. А.А. Носік упершыню прапанавала іх класіфікацыю, даследавала асаблівасці функцыянавання, сабрала іх і сфарміравала ў слоўнік, паспяхова вырашыўшы праблему іх лексікаграфічнага прадстаўлення.

Структураванне дысертацыі і адлюстраванне яе зместу адпавядае прадстаўленай мэце і выразна акрэсленым задачам. Главы дысертацыйнага даследавання і іх анатацыя ў аўтарэфераце дэманструюць навукова-тэарэтычную паўнату зместу работы, грунтоўную прэзентатыўнасць фактычнага матэрыялу, глыбокае веданне даследуемай праблемы.

Дысертантка значна паглыбіла наяўныя веды аб эматыўнасці беларускага лексікону, што дазволіла атрымаць новыя дадзеныя аб лінгвістычнай рэалізацыі моўнай катэгорыі эматыўнасці. Атрыманыя вынікі значным чынам пашыраюць веды аб канатацыі лексем і садзейнічаюць пашырэнню тэарэтычнай базы беларускай лінгвістыкі ў цэлым.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў даследавання з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў практыцы выкладання шматлікіх лінгвістычных курсаў (такіх, як Сучасная беларуская мова (раздзел “Лексікалогія”), Агульнае мовазнаўства, Параўнальная граматыка) і спецкурсаў, прысвечаных пытанням лексікалогіі, псіхалінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, мемасіялогіі, дэрываталогіі. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання, а таксама сістэматызаваны, абагульнены і інтэрпрэтаваны з улікам новых падыходаў да вывучэння моўных пытанняў, значны і арыгінальны фактычны матэрыял можа быць выкарыстаны ў далейшых навуковых працах, улічаны пры тэарэтычным апісанні лексічнай сістэмы беларускай мовы, распрацоўцы праблем лексічнай тыпалогіі, семантыкі і лексікаграфічнай практыкі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Адзначым высокую ступень апрабацыі вынікаў самастойнага дысертацыйнага даследавання, якія адлюстраваны ў 20 публікацыях саіскальніцы, з іх 5 – артыкулы у рэцэнзуемых перыядычных выданнях (2,3 аўт. арк.); 7 – артыкулы ў зборніках навуковых прац (2,2 аўт. арк.), 8 – публікацыі ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (1,7 аўт. арк.). Агульны аб’ём надрукаваных матэрыялаў складае 6,2 аўт. арк. Усе публікацыі выкананы саіскальніцай без суаўтараў.

Асноўныя вынікі і тэарэтычныя палажэнні дысертацыі былі абмеркаваны і атрымалі станоўчую ацэнку на наступных міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: «Этнокультурный и социолингвистический аспекты теории и практики преподавания языков)» (Мінск, 2015 г.), «Теория и практика преподавания лингвистических дисциплин в вузах негуманитарного профиля» (Горки, 2015 г.), «Язык и межкультурные коммуникации» (Мінск, 2015 г., 2019 г., 2021 г.), «Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследавнняў» (Мінск, 2017 г., 2023г.), «Общественные и гуманитарные науки» (Мінск, 2019 г.), «Технологии обучения русскому языку как иностранному и диагностика речевого развития» (Мінск, 2020 г., 2022 г.), «Актуальные вопросы современной лингвистики и методики преподавания иностранных языков» (Горкі, 2020 г.), «XXIIТанкаўскія чытанні» (Мінск, 2020 г.), «XXIIIТанкаўскія

чытанні» (Мінск, 2022 г.), «Образование и наука в XXI веке» (Мінск, 2022 г.). Матэрыялы дысертацыі ўкаранёны ў навучальны працэс кафедры беларускай і рускай моў УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» (акт аб укараненні 25.11.2022).

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

У працы поўнасцю ўлічаны патрабаванні ВАК да афармлення зместу, структуры работы, бібліяграфічнага апісання літаратурных крыніц і дадаткаў. У цэлым аўтарэферат і дысертацыя цалкам адпавядаюць Інструкцыі ВАК па іх афармленні. Дысертацыя напісана ўзорнай літаратурнай мовай з добрым веданнем асаблівасцей яе навуковага стылю, вызначаецца лагічнай структурай і дарэчным ужываннем спецыяльнай тэрміналогіі. Аўтар даследавання з вялікай ўвагай ставіцца да прадмета даследавання і да свайго адрасата. Аўтарэферат А.А. Носік адпавядае зместу дысертацыйнай работы і асноўным навуковым вынікам праведзенага даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыя з'яўляецца закончаным даследаваннем, вынікі якога атрыманы аўтарам асабіста і самастойна. А. А. Носік самастойна распрацавала канцэпцыю навуковай працы, правяла эксперыментальны адбор, класіфікацыю моўнага матэрыялу, выпрацавала, абгрунтавала і рэалізавала прынцыпы яго вывучэння.

Дысертацыйнае даследаванне цалкам адпавядае ўзроўню навуковай кваліфікацыі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. У працы праводзіцца кваліфікаваны навуковы аналіз тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, даследаванне мае самастойны характар з арыгінальнымі палажэннямі і высновамі.

**Недахопы дысертацыі.**

Кацэптуальных заўваг па змесце дысертацыі няма. Выкажам толькі некаторыя пажаданні, якія, як нам падаецца, будуць на карысць даследчыцы.

1. У далейшай навуковай працы звярнуцца да жывога гутарковага маўлення, што, на нашу думку, значна пашырыць фактычны матэрыял рэалізацыі эмтыўнасці не толькі ў лексічным, але і ў словаўтваральным плане;
2. Пашырыць вельмі салідны бібліяграфічны спіс такімі аўтарамі, як Б.Ю. Норман (да прыкладу, артыкул «О факторах, влияющих на выбор слова говорящим», прысвечаны ў тым ліку і катэгорыі апраксімацыі) і Г. Латушка (даследавала катэгорыю *згоды-нязгоды* ў славянскіх мовах);
3. Цікава было б даследаваць эмацыйную сферу беларускай мовы ў гендарным дачыненні.

Але, відаць, гэта перспектыўныя задачы для тых, хто будзе займацца праблемай далей.

У якасці пытання на адрас даследчыцы выкажам наступнае:

- Ці зменіцца калі-небудзь несуцяшальная статыстыка значнай, як бачым, перавагі прэзентацыі негатыўных эмоцый над пазітыўнымі? Чаму?

Зрэшты, хочацца думаць, што і Алеся Анатольеўна на дасягнутым не спыніцца.

**Заключэнне.**

Кандыдацкая дысертацыя А. А. Носік – канкрэтны, самастойны, значны і карысны ўнёсак у нацыянальную навуку і маўленчую культуру.

Дысертацыя з’яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай работай, выкананай пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, прафесара, дэкана філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» В. Д. Старычонка, і адпавядае спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова, па якой яна прадстаўлена да абароны.

У адпаведнасці з п.19, 20 Палажэння аб прысуджэнні ступеняў і прысваенні вучоных званняў вучоная ступень кандыдата філалагічных навук можа быць прысуджана А. А. Носік за:

– пераканаўчае абгрунтаванне рэпрэзентацыі катэгорыі эмацыянальнасці ў сістэме беларускай мовы;

– распрацоўку класіфікацыі негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху;

– выяўленне спецыфікі рэпрэзентатыўнасці пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення;

– стварэнне і апісанне ЛТГ з інварыянтным значэннем эмоцый у СБЛМ;

– выяўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў корпусе эмацыянальных намінацый і асноўныя семантычныя мадэлі ўтварэння другасных ЛСВ;

– стварэнне «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека».

Афіцыйны апанент
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
дацэнт кафедры
беларускага мовазнаўства
філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ю.В. Назаранка

19.06.2024г.